# УЖО ПРАЯВА ЛЮБОВІ»

— Сэнс жыцця чалавека на зямлі — богапрыпадабненне. Мы закліканы стаць богападобнымі. А паколькі Бог — гэта Любоў, то і мы, вернікі-хрысціяне, павінны выхаваць у сабе гэты каштоўны дар. Я ведаю адну жанчыну, якая была ў састарэлым узросце і па немачы сваёй ужо не магла выходзіць з кватэры. Яна вельмі перажывала, што не можа тварыць справы любові і міласэрнасці. Дык вось, яна падыходзіла да акна, абапіралася на падаконнік і глядзела на вуліцу. Бачыць, ідзе па вуліцы мужчына з палачкай, кульгае. Думае: «Госпадзі, ён такі няшчасны, дапамажы яму!» Хтосьці нясе цяжкія сумкі, яна звяртаецца да Бога: «Госпадзі, як цяжка чалавеку, дапамажы яму». Яна з кватэры не магла выйсці, але спачувала людзям, малілася і жадала ім дабра. Хіба гэта не добрыя справы? Гэтага і чакае ад нас Гасподзь: спагады і спачування чужому болю. Гасподзь бачыць наш унутраны стан, наша імкненне шукаць Бога і жаданне імкнуцца ў Царства Нябеснае, а яно знаходзіцца ўнутры нашага сэрца.

Мы павінны памятаць, што Бог заўсёды знаходзіцца ў нашым сэрцы, нават калі мы адварочваемся ад Яго. Задача кожнага хрысціяніна — прыпадабняцца Хрысту, а на гэтым шляху нам варта змагацца са сваімі страсцямі, якія ў кожным з нас жывуць і ствараюць перашкоду на шляху богапрыпадабнення.

Прападобны Серафім Сароўскі сказаў: «Здабудзь дух мірны, і вакол цябе выратуюцца тысячы». Імкненне выхаваць у сабе дух мірны і благадаць Духа Святога — гэта і ёсць мэта хрысціянскага жыцця.

Цяжкі гэты шлях — богапрыпадабненне, але ён цалкам магчымы для кожнага, хто хоча выратаваць сваю душу і ўвайсці ў Царства Нябеснае. Нам варта пачынаць з малога. Калі захочацца адказаць крыўдзіцелю — прамаўчы, трэба імкнуцца не прайсці міма таго, хто жыве ў нястачы. Калі не можаш аказаць канкрэтную дапамогу, то ў думках звярніся да Госпада і скажы: «Госпадзі, не магу дапамагчы, хто ў тым мае патрэбу, дапамажы яму Ты, як можаш». Калі наша жыццё будзе напоўнена справамі дабра, любові і міласэрнасці, зменімся мы і зменіцца ў лепшы бок жыццё людзей на зямлі.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

***— Але ж не ўсе сёння — пагалоўна веруючыя. Як думаеце, што ўвогуле можа прывесці сучаснага чалавека ў Царкву, калі яго жыццё поўніцца клопатам аб матэрыяльным?***

— Думаю, што варта ўспомніць словы Хрыста Збавіцеля: «Не вы Мяне выбралі, але Я вас выбраў» (Ін. 15,16). Гасподзь усіх без выключэння заклікае да выратавання. Але толькі той, хто адгукнецца на заклік Божы і сапраўды пажадае выратавання сваёй душы, — прыйдзе ў Царкву. Мімаволі ўзнікае іншае пытанне: «А чаму не ўсе ў такім выпадку адгукаюцца на гэты заклік?» Адказ просты. Калі чалавек пагодзіцца прыняць Евангелле, то яму прыйдзецца змяніць свой ранейшы заганны лад жыцця. Не ўсе да гэтага гатовыя. Змяняць сябе, працаваць над сабой, над сваімі пачуццямі і думкамі — гэта заўсёды подзвіг. Значна прасцей — паеў і на канапу. А калі ў доме тэлевізар, то яшчэ і забавы пад бокам, ляжы і пстрыкай кнопкамі на пульце. Але гэты шлях бяздзейнасці заўсёды вядзе чалавека ў пагібель.

**«Людзі, далёкія ад Царквы, сёння чакаюць ад вернікаў амаль роўнаанёльскага жыцця, суцэльную любоў і добрае стаўленне адно да аднаго і асабліва да іх».**

***— Зараз па тэлевізары амаль кожны дзень можна ўбачыць тэракты, крушэнні, забойствы, у якіх паміраюць ні ў чым не вінаватыя людзі, дзеці, старыя. Хочаш-не хочаш задаешся пытаннем: чаму Бог гэта дапускае?***

— А пры чым тут Бог? Хіба гэта Бог падкладае бомбы, страляе, запускае ракеты, забівае? Бог стварыў чалавека не для таго, каб ён забіваў, а для таго, каб ён, выконваючы запаведзі Божыя, дасягаў святасці і прыпадабняўся Богу, услаўляючы свайго Стваральніка. А ўслаўляючы Бога, удзельнічаў у Божай любові і дабрыні ў Царстве Нябесным. Вось якая была задума ў Бога перад тварэннем свету і чалавека. Але чалавек выбраў іншы шлях, а зграшыўшы і ўсвядоміўшы, што ён нарабіў, зараз шукае сабе ва ўсім апраўданне. Свайго граху і злачынстваў не хоча бачыць, а ва ўсіх бедах і правінах вінаваціць усіх, але толькі не сябе. У гэтым корань усіх нашых бед і нестраенняў. Апынуўшыся ў такім становішчы, чалавек спрабуе зваліць сваю віну на іншага, гэта значыць шукае «ахвярнага казла», а не знаходзячы яго, усё зло перакладае на Бога. І ў выніку ва ўсім вінаваты Бог, але ніяк не чалавек.

Царква на працягу вось ужо двух тысячагоддзяў заклікае людзей не шукаць вінаватых звонку. Чалавек, зазірні ў свой унутраны свет, і ты зразумееш, што Бог нічога дрэннага нам не зрабіў. Усё дрэннае здзейснілі мы самі, супраціўляючыся Богу і жывучы так, як нам хочацца.



***— Як вы лічыце, які шлях складанейшы: манаскі або сямейнага жыцця?***

— У кожным кірунку ёсць свае цяжкасці і радасці. Не кожны можа стаць манахам і не ў кожнага складваецца сямейнае жыццё. Думаю, што несці подзвіг сямейнага жыцця складаней, чым манаскага. У сям'і кожны імкнецца да свайго асабістага шчасця, а манаская абіцель — гэта таксама духоўная сям'я, але тут усе свядома выбралі гэты шлях і гатовыя жыццё сваё пакласці за бліжняга свайго, каб здабываць благадаці Святога Духа. Сямейнае жыццё — гэта штодзённы подзвіг. Калі подзвігу не будзе, такая сям'я не ўстаіць і распадзецца.

**«Гэтага і чакае ад нас Гасподзь: спагады і спачування чужому болю. Гасподзь бачыць наш унутраны стан, наша імкненне шукаць Бога і імкнуцца ў Царства Нябеснае, а яно знаходзіцца ўнутры нашага сэрца».**

Многія маладыя людзі, беручыся шлюбам, не разумеюць сапраўднага сэнсу сямейнага жыцця. Нехта ў сямейным жыцці шукае задавальнення для сябе, а нехта спадзяецца, што, уступіўшы ў шлюб, пазбавіцца ад паўсядзённых побытавых клопатаў. Адзін малады чалавек мне калісьці сказаў: «Вось дажыў да трыццаці гадоў і думаю, да якога часу буду сам сабе мыць шкарпэткі і гатаваць ежу? Трэба ажаніцца, і хай жонка клапоціцца пра мяне». А жанчына, дасягнуўшы такога ж узросту, думае: «Дакуль жа я буду працаваць, трэба выйсці замуж і хай муж мяне ва ўсім забяспечвае». Два эгаісты сышліся, паспрабавалі жыць дзеля сябе, але доўга не пратрымаліся і разбегліся. А потым кажуць: не сышліся характарамі.

***— І што ж можа іх падштурхнуць змяніцца? Што наогул можа змякчыць чалавечае сэрца, душу?***

— Прыклад нам даў Хрыстос Збавіцель. У хрысціян ёсць прыклад, да якога мы павінны імкнуцца. Гэта Збавіцель свету — Ісус Хрыстос. Апостал Павел аднойчы выказаў выдатную думку: «Пераймайце мяне, як я — Хрыста» (1 Кар. 4,16). І для апостала Паўла Ісус Хрыстос быў узорам для пераймання. Рэкамендую ўсім часцей чытаць Евангелле. Яно дапаможа нам раскрыць глыбіню і сэнс чалавечага жыцця на зямлі. Там — адказы на ўсе нашы пытанні...

**Веранiка ПУСТАВІТ.**
*pustavit@zviazda.by*

■ Кніжная паліца

## ШЛЯХ ДА НЕЗАЛЕЖНАСЦІ

Пабачыла свет сумеснае выданне гісторыкаў Ігара Пушкіна і Аляксандра Агеева, прысвечанае дзейнасці першай беларускай арганізацыі ў Магілёве

**Сёлета спаўняецца сто гадоў з моманту стварэння Магілёўскага беларускага камітэта, які адыграў значную ролю ў грамадскім жыцці таго перыяду. На 288 старонках выкладзены рэдкі фактaлагічны матэрыял, унікальныя здымкі першакрыніц. Кніга ўжо паспела стаць гістарычным бестселерам. Бо на сённяшні дзень гэта адзінае падрабязнае апісанне тых падзей, якія адбываліся ў Магілёве на працягу года існавання камітэта.**

— Мы зараз шмат кажам аб самаідэнтыфікацыі беларусаў, а гэта былі першыя спробы зрабіць краіну незалежнай. Беларуская дзяржаўнасць пачынаецца з моманту правядзення Першага Усебеларускага з'езда ў Мінску ў снежні 1917 года, але мала хто ведае, што спачатку планавалі гэты ўсебеларускі з'езд (у кнізе прыведзены пацвярджальныя дакументы) правесці ў Магілёве. Гэта ідэя аб'яднала ўсіх жыхароў горада. Магілёў стаў другім пасля Мінска горадам Беларусі, які падтрымаў ідэю самастойнасці нашай дзяржавы, — адзначае **дацэнт кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін МДУ імя А. А. Куляшова Аляксандр АГЕЕЎ.**

— Шлях да нашай незалежнасці пачынаўся менавіта тады, сто гадоў таму, — дадае **кандыдат гістарычных навук, дацэнт Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта харчавання Ігар ПУШКІН.** — І ў гэтым кантэксце нам было асабліва цікава працаваць над кнігай. Беларусы, яўрэі, рускія, палякі прагаласавалі за стварэнне сваёй дзяржавы. Гэта ўсё адбывалася ва ўмовах грамадзянскай вайны, нестабільнасці. Цікавымі былі іх адносіны да беларускай мовы. Яны былі за тое, каб на ёй размаўлялі, праводзілі культурна-асветніцкія мерапрыемствы.

Аўтары манаграфіі на працягу некалькіх гадоў збіралі матэрыялы ў дзяржаўных архівах Мінска, Магілёва, Вільнюса, Масквы. Большую частку копій рэдкіх дакументаў яны перадалі музею гісторыі Магілёва. Гісторыкі ўдзячныя жыхарам Магілёва за цікавасць да тэмы, гэта, кажуць яны, прымушала іх працаваць у паскораным тэмпе. Знаходзіліся добрыя людзі, якія дапамагалі з часовым пражываннем у Мінску і Вільнюсе, садзейнічалі ў адкрыцці візы, прапаноўвалі транспарт. Атрымалася нешта накшталт сумеснай грамадскай акцыі. На жаль, тыраж кнігі абмежаваны, таму купіць яе будзе складана. Затое яе можна знайсці ў бібліятэках.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

***Дзяды твае жывуць не ў занябессі.***
***Навошта ім халодныя вышыні?***
***Яны зышліся у спрадвечным лесе,***
***Дзе цар-дубы ды цнотныя шыпшыны.***

***Там птах дзядам пра любы край спявае,***
***Там з-пад ігліцы ручаінка льецца...***

***Куды ж ты пойдзеш ад зямлі, якая***
***Сілкуе успамінам тваё сэрца?..***

***Дзяды нябачна ўсюды крочаць з намі,***
***Нячутна ўсюды з намі размаўляюць -***
***Мінулае працалі каранямі***
***І ў вершалінах новы дзень люляюць.***

